Мілда РЫЧКУЦЕ
(г. Вільня)

# УМОВЫ ДЗЕЙНАСЦІ УСТАНОЎ КУЛЬТУРЫ ПОСТСАВЕЦКАЙ ПРАСТОРЫ, ПЕРАПРАФІЛЯВАНЫХ У ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ ЦЭНТРЫ: ВІЛЕНСКІ ЭТНАКУЛЬТУРНЫ ЦЭНТР НА ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

*Калі дазволіць усім народам на свеце абраць найлепшыя звычаі і паводзіны, то кожны народ, уважліва разгледзеўшы чужыя, абраў бы лепшымі свае* [2].

Герадот

Пасля атрымання Летувой незалежнасці, кіраванне дзейнасцю ў галіне культуры было перабудавана па новых стандартах у адпаведнасці з патрабаваннямі часу.

Згодна з апошнімі правіламі, культурай народаў, якія не з'яўляюцца тытульнымі этнасамі Летувы (беларусы, палякі, габрэі, украінцы, рускія), займаецца спецыяльны Дэпартамент па нацыянальных меншасцях пры ўрадзе Летувіскай Рэспублікі. Дэпартамент ажыццяўляе сур'ёзную працу ў галінах адукацыі, выхавання, фестывальнага руху. Сёння ў прадстаўнікоў народаў, якія, як вядома, здаўна жылі і працавалі побач з летувісамі, у Вільні ёсць свае школы (беларуская гімназія імя Францыска Скарыны, польскія, украінскія, рускія), наладжваюцца рэгулярныя семінары і канферэнцыі, праводзіцца нават Міжнародны фестываль фальклору "Покровские колокола".



Але большасць устаноў культуры – былыя палацы, дамы культуры – ў постсавецкі час былі падпарадкаваныя органам мясцовага самакіравання і збольшага скіраваныя на культуру летувісаў. Віленскі этнакультурны цэнтр падпарадкаваны муніцыпалітэту Вільні – гарадскому самакіраванню, у складзе якога дзевяць дэпартаментаў. Адзін з іх – Дэпартамент спорту, адукацыі і культуры, падзелены на тры аддзяленні, дзейнасць аднаго з якіх скіравана на культуру. Гэта аддзяленне курыруе хары, аркестры, шэсць культурных цэнтраў. Адным з іх з'яўляецца Віленскі этнакультурны цэнтр. Праз свой дэпартамент Цэнтр атрымлівае дзяржаўныя датацыі для камунальных плацяжоў, аплаты паслуг сувязі, гэта значыць, для самазабеспячэння. Але для імпрэз, канцэртаў і фестываляў, якія ладзім, мы павінны зарабляць грошы самі. У Цэнтры працуюць 13 маіх калег. Мы з'яўляемся досыць living рознымі спецыялістамі: ёсць этнолагі і фалькларысты, педагогі, спецыялісты па камунікацыі, менеджменту.

Адзінае, што нас яднае ў творчы калектыў – любоў і павага да этнічнай культуры летувісаў. Менавіта праца з этнічнай культурай – шлях да захавання той сукупнасці філасофскіх, прававых, маральных, этычных і эстэтычных поглядаў майго народа, якая дагэтуль дазваляла яму існаваць. Карысць для этнаэкалогіі працы з фальклорам нельга недаацэньваць.

Вось як ставіліся ў свой час да дзейнасці піянера сістэмнай латышскай фалькларыстыкі Крыш'яніса Барана, на працах якога ў XIX-XX стст. мацавалася самасвядомасць латышоў: "Усе яго пачынанні маюць практычны накірунак, аднак іх мэта непрактычна, а менавіта – ўзняць да самастойнага нацыянальнага значэння маленькі народ, які доўга знаходзіўся пад панаваннем чужой культуры" [1]. Як бачым, "знаўцы-дабрадзеі" памыліліся: сёння Латвія – унітарная незалежная краіна паўночна-ўсходней Еўропы, дзе фальклорныя абрады – афіцыйныя дзяржаўныя святы. Таму словы з латышскай дайны: "Калі нарадзіўся – не крычаў, а спяваў, /З песняй пражыў увесь свой век, /З песнямі мяне пакладуць /На пагосце пад белым узгоркам"[1] – не выпадковая цытата, а своеасаблівае эстэтычнае крэда адданасці Радзіме, убудаванае ў ментальнасць народа.

У нашым Цэнтры толькі д з в е  с е к ц ы і – секцыя этнічнай адукацыі і секцыя святаў і фестываляў, якія ладзяць фальклорныя фестывалі і народныя святы, семінары, курсы, workshop'ы. У с е к ц ы і  э т н і ч н а й  а д у к а ц ы і дзве супрацоўніцы рыхтуюць імпрэзы для дзяцей, супрацоўнічаюць са школамі Вільні, іншых гарадоў Летувы, са знаўцамі фальклору з розных устаноў краіны. Распрацоўваюцца спецыяльныя праграмы, падбіраюцца прафесіяналы, якія навучаюць усіх жадаючых розным народным рамёствам Летувы. На наладжаныя імі заняткі прыходзяць дзеці, падлеткі і, часам, дарослыя, якія напрыканцы атрымліваюць адпаведны сертыфікат. Таксама мы збіраем культурна-антрапалагічныя экспедыцыі, праводзім майстар-класы па народнай творчасці. Для гэтага не толькі штогадова ездзім па вёсках і мястэчках Летувы, але і запрашаем людзей у Вільні, якія прыехалі з іншых рэгіёнаў. Яны дэманструюць сваю традыцыйную культуру: спяваюць, танчаць, граюць на інструментах, рамеснічаюць, распавядаюць. У XXI стагоддзі, вядома, амаль нічога не даследаванага раней не знаходзіцца. Старыя людзі - носьбіты фальклору - паміраюць, ім на змену прыходзяць людзі больш маладзейшыя...

Асобная секцыя Цэнтра займаецца с в я т а м і  і  ф е с т ы в а л я м і. Штогод мы прапаноўваем шэраг праектаў для Міністэрства культуры Летувы, міжнародных фондаў, у якіх абгрунтоўваем мэтазгоднасць фінансавання сваёй дзейнасці. Яны іх разглядаюць і фінансуюць тое, што лічаць вартым падтрымкі. Калі для святаў і фэстаў не хапае сродкаў, мы шукаем спонсараў, якім трэба рэклама. Таксама мы збіраем банк дадзеных пра этнічную культуру Летувы з выданняў, прэсы, мультымедыйных крыніц, часам, самі пішам для СМІ. Для каляндарна-святочнай дзейнасці Цэнтра мы абралі пяць самых буйных каляндарных святаў Летувы. Гэта святы, прымеркаваныя да сонцаваротаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

раўнадзенстваў, святы т.зв. «Сонечнага крыжа». Сярод іх: зімовыя святы Эдентус – свята перад Калядамі, Плугас – першы дзень Калядаў, калі балты цягнулі па сваіх вуліцах дрэва-калоду; веснавая Маслянка (Užgavenes) – з маскамі, півам і тлустай ежай; летняе найважнейшае свята летувісаў, латышоў і беларусаў – Іванаў дзень (Rasa, Kupalių sventė); дзень восеньскага раўнадзенства – калі чалавек можа магічна пазбавіцца таго, што яго турбуе і непакоіць.

Акрамя каляндарных святаў, мы ладзім штогадовы вялікі ф е с т ы в а л ь ф а л ь к л о р у «Skamba-skamba, kankliai», умовы якога вельмі падобныя на тыя, пра якія паведаміў Мікола Козенка: людзі граюць на аўтэнтычных інструментах і спяваюць у аўтэнтычнай спеўнай манеры творы, якія яны пераймалі ад вясковых носьбітаў фальклору.

На U ž g a v e n e s Цэнтр ладзіць у Вільні традыцыйныя шэсці з маскамі. Там заўсёды ёсць на што паглядзець. У Летуве ёсць шмат клубаў масак, якія дзейнічаюць перманентна, але выкарыстанне масак у самім рытуале свята Маслянкі – гэта іншае. Сам працэс наладжаны па-іншаму – розныя традыцыйныя маскі з розным сэнсам. У масленічным гурце летувісаў ёсць група масак, якую клічуць «Жыды», але гэта не таму, што маскіраваныя людзі паказваюць габрэяў, а таму, што гэта замежнікі, нелетувісы. Імі могуць быць людзі, апранутыя як венгры, габрэі, цыгане. Другая катэгорыя масак – жывёлы («Конь», «Каза», «Жораў» і інш.), трэцяя – дэманічныя істоты: «Ведзьма», «Чорт», «Смерць» Амаль абавязкова ў гурце масак ёсць «Доктар», «Маладая» і «Малады» (прыклады травестыйнага пераапранання), «Генерал», «Вершнік» (складаны касцюм, дзе чалавек паказвае і каня, і вершніка на ім). На гэтае свята ядуць шмат і вельмі тлуста – так заведзена; паўсюль гучыць громкая музыка. Людзям падабаецца U ž g a v e n e s , таму, што, фактычна, гэта – карнавал, на якім можна рабіць усё, што заўгодна. Але мы заўважылі, што людзі, акрамя звыклага, штогод чакаюць і нечага новага. Ім часам не хапае традыцыйнага сцэнару шэсця і жартаў масак. Час змяніўся, і ты ўжо не можаш увайсці ў горадзе ў кожны дом, як гэта некалі было заведзена, паразмаўляць з кожным, сказаць нешта добрае. Мы вырашаем гэту праблему па-рознаму. У 2006 годзе задзейнічалі пад святочную пляцоўку галоўны праспект Вільні, падзялілі яго на розныя падвор'і. У кожным з іх была пэўная група масак: у адным – толькі цыгане, у другім – толькі жывёлы, у трэцім - дактары. Людзі крочылі па праспекце і атрымлівалі паслугу, адпаведную характару групы: падыходзячы да доктара, чалавек атрымліваў пілюлю, да габрэя ў банку – мог узяць грашовую купюру і г.д. Мы імкнемся, каб людзям было цікава. Ёсць такі персанаж – «Малпа». Гэтая істота хоча паказацца людзям і гэтым пацяшае натоўп. Самы галоўны персанаж Маслянкі мы завем «Мāрі» – гэта антрапаморфнае пудзіла – персаніфікацыя зімы, холаду, цемры. Яго робяць

падобным на расійскую Бабу-Ягу, з вялікімі грудзямі. У адпаведнасці з традыцыяй гэтая пачвара павінна заехаць у кожны двор. Мы возім яе на вазочку ад падвор'я да падвор'я, да кожнага персанажа, рыхтуючы да ўрачыстага развітання з ёй. Па традыцыі, напрыканцы свята пудзіла трэба спальваць. Сёлета, аднак, мы не сталі гэтага рабіць... У горадзе вялікае вогнішча раскласці складана, таму мы хацелі, каб пудзіла зімы адляцела на паветраным шары.

Этнаграфічна Маслянка ў Летуве заўсёды прыпадае на аўторак. Мы маем дзве ці тры гадзіны ўвечары ў аўторак для святкавання. Гэта не вельмі зручна ні для нас, ні для гледачоў, якія імкнуцца наведаць свята. Таму мы дазволілі сабе пачынаць раней. Цэнтр святкуе ў суботу, потым перадае «эстафету» іншым клубам і цэнтрам Вільні, а ў аўторак святкуе ўжо ўся Летува. Да маскіравання паўсюль шырока далучаюць дзяцей, для іх гэты працэс заўсёды цікавы. Звычайна дзяўчаты апранаюцца цыганкамі, а хлопцы - чарцямі. Апошнім часам яны пазбягаюць стэрэатыпаў – шукаюць сябе ў вобразах каня, смерці, жорава. Дзеці самі шукаюць адказ на пытанне: «Што я павінен рабіць?» Часам касцюміраваныя шэсці ў Вільні і Коўна ператвараюцца ў маштабныя (да некалькіх тысяч удзельнікаў) працэсіі па цэнтральных вуліцах з музыкай, рогатам, шумам, імправізаваным грукатам у чыгуны і вёдры, наперадзе якіх вязуць у вазочку зіму-«Мáрі» з эскортам вершнікаў з паходнямі. Гэта прыцягвае ўвагу людзей, дазваляе ім «абтрэсці рэшткі зімовага сну», падрыхтавацца да надыходу вясны.

Наступнае свята – свята сярэдзіны лета – Іванаў дзень. Сёння гэта свята, як кажуць у нас, «Крочыць сваім ходам», – адпраўляецца спантанна, без асаблівых намаганняў. Пры сур'ёзнай арганізацыі, ва урбаністычных умовах, яно патрабуе грунтоўнай падрыхтоўкі, фінансавых укладанняў. Ужо два-тры гады мы яго спецыяльна не рыхтуем.



Многія летувісы хацелі, каб гэта было дзяржаўнае свята, як у Латвіі. Спробы наладзіць нешта агульнанацыянальнае, на жаль, звялі ўсё да поп-канцэртаў. Да рэшты не вызначана, як гэта рабіць ва ўмовах горада? Вядома, старажытны рытуал з вогнішчамі і карагодамі прыгожы, ён падыходзіць да свята, але як адрозніць яго сапраўдныя элементы ад пазнейшых рэканструкцый? У нас ёсць два варыянты – хрысціянская і этнічная балтыйская (фальклорная) традыцыі яго святкавання. Атрымліваецца – два святы ў адным. Свята наладжваецца з 24-га на 25-е чэрвеня. Канечне, «па сонцу» яно павінна быць раней –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з 21-га на 22-е, калі астранамічна самая кароткая ноч і самы доўгі дзень. Некаторыя камерцыйныя каналы часам робяць з гэтага сапраўднае поп-шоу, і мы ў гэтым не замінаем: людзі самі абіраюць тое, што імкнуцца бачыць.

Яшчэ адно свята ў маштабах Вільні ладзіцца ўвосень, у дні раўнадзенства. Звесткі пра абраднасць гэтага перыяду ў народным календары даволі цьмяныя. Мы праводзім у гэты час фестываль вогненных скульптур. Чаму мы лічым, што гэта мае дачыненне да «этна»? Таму, што ў гэтых скульптурах задзейнічаны героі, якія ўзятыя з нашай міфалогіі. Ладзіцца фестываль на вялікім стадыёне, гэта прыгожы рытуал, у якім задзейнічаны фальклорныя калектывы. Прыходзіць вельмі шмат людзей. Звычайна выявы, якія вырабляюць мастакі – гэта імправізацыі на фальклорныя матывы. Напрыканцы мы спальваем гэтыя скульптуры. Людзі ўжо прызвычаіліся, што ўвосень ёсць такое свята.



М э т а нашай дзейнасці – любымі сродкамі захаваць этнічную культуру Летувы, адаптаваць наш фальклор, каштоўнасці традыцыйнай (вясковай) культуры нават да ўмоў урбанізму. Сёння мы даем сабе справаздачу, што калі мы будзем прапагандаваць толькі неадаптаваныя формы фальклору, гэта можа спужаць, адвабіць сённяшніх непадрыхтаваных да яго дзяцей і моладзь. Ім трэба прыманка. Часам праз а д а п т а в а н ы я да свядомасці сучасніка формы – постфальклор – мы набліжаем зацікаўленых да каштоўнасцей этнічнай культуры летувісаў. Т.Пладунова лічыць, што поспех фальклорнага руху Летувы завязаны выключна на дакладнай этнічнай ідэнтыфікацыі летувісаў, але ўсё гэта не зусім так... Магчыма, гэта – погляд збоку. Пэўны час назад большасць жыхароў Летувы хацела быць не летувісамі, а еўрапейцамі... Як зазначылі ў свой час заснавальнікі летувістыкі: «Rozprawy o dawnej Litwie zagaja się stereotypowym frazesem, jakoby Litwini byli jednym z najstarszych ludów europejskich, chotiaż dobrze wiadomo, że w Europie poszli oni razem ze Slowianami, Niemcami, Italami I Grekami z ednego pnia I rodu, że wiec ani są starsi, ani młodsi od innych» [3]. Сапраўды, большасць еўрапейцаў, а, найперш, усходнееўрапейцаў – маюць адны карані, але мы такія розныя, і гэта добра.

Каштоўнасці традыцыйнай культуры тычацца вельмі глыбокіх псіхалагічных, біясацыяльных рэчаў, часам маюць выхады на агульначалавечыя ідэалы і светапоглядныя сістэмы абстрактнага гуманізму. Але мы далучаемся да іх праз генетычна родныя нам матчыну мову і матчыну песню, потым, з узростам інтэлектуальна асэнсоўваем, і калі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

замест апошніх падкласці штучны сурагат, яшчэ вельмі спрэчна, ці сфарміруецца ў нашай свядомасці касмапалітычны гуманізм і чалавечнасць? На мой погляд, сёння тыя формы працы з народнай культурай, якія мы практыкуем у Цэнтры – паспяховыя і запатрабаваныя грамадствам, і іх чакае яшчэ доўгі і паспяховы ўжытак у практыцы ўстаноў культуры постсавецкай прасторы.

У XXI стагоддзі ў с т а н о в ы к у л ь т у р ы постсавецкай прасторы, скіраваныя на народную творчасць, будуць існаваць у н а с т у п н ы х у м о в а х:

- падпарадкаванне мясцовым органам самакіравання;
- змешанае фінансаванне: мінімальныя (для самазабеспячэння) дзяржаўныя датацыі і шырокае далучэнне сродкаў спецыялізаваных фондаў і спонсарскіх сродкаў для фінансавання дзейнасці;
- арыентацыя на аўтэнтычныя ўзоры народнай культуры як на своеасаблівы эстэтычны камертон зместу творчасці;
- пошук нофых форм далучэння да фальклору моладзі з абавязковым захаваннем яго зместу – эстэтычных, светапоглядных, этнаэкалагічных складальнікаў народнай творчасці.

**Л і т а р а т у р а**


1. Приеде, Г. Кришьянис и его «Латышские дайны» / Г. Приеде // Латышские дайны : из собрания Кришьяниса Барона, 1894 – 1915 / пер. с латыш. – М. : Худож. лит, 1985. – С. 3 – 11.
2. Токарев, С.А. Историня изучення календарных обычаев и поверий / С.А.Токарев // Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы : исторические корни и развитие обычаев. – М. : Наука, 1983. – С. 8 – 23.
3. Bruckner, A. Wstep / A. Bruckner // Bruckner A. Starozytna Litvwa. Ludy i bogi. – Olsztyn : Wydawnictwo pojezierze, 1985. – P. 7 – 20.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ